**Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Сярэдняя школа № 3 г. Лепеля”**

Урок беларускай літаратуры ў 6 класе

# *Сапраўдны сябар. Які ён?*

Чытаем апавяданне Алены Васілевіч «Сябры»

*Пушкіна Надзея Іванаўна,*
*настаўнік вышэйшай катэгорыі*

**2013 г.**

*Сучасны ўрок літаратуры – духоўнае адкрыццё. І кожны ўрок – з’ява цікавая і захапляльная. Вывучаемы твор можа выклікаць у падлеткаў супярэчлівыя пачуцці, барацьбу меркаванняў і ацэнак. Кожны вучань можа ўбачыць у адным і тым жа героі добрае і благое, высокае і нізкае. На ўроку літаратуры шасцікласнікі вучацца выказваць свае меркаванні, разважаць, весці дыялог, параўноўваць герояў, даваць ацэнку іх паводзінам і ўчынкам, знаходзіць новую інфармацыю, умець параўнаць яе з той, якую набылі раней. Важна і тое, што ўрок літаратуры – гэта творчасць, а вучні ўвесь час у творчым пошуку. У іх фарміруецца культура групавой дзейнасці. Кожны з іх можа быць задаволены вынікамі ўласнай працы, рабіць самаацэнку сваіх поспехаў, крытычна ставіцца да сваіх няўдач.*

***Мэты:***

- ✓ *вучыць вызначаць галоўную думку твора, значэнне слоў “дружба”,” сябар”, “сяброўства”, “таварыш”, “прыяцель”;*
- ✓ *развіваць уменні характарызаваць і параўноўваць герояў на падставе іх учынкаў і паводзін; выказваць свае думкі і меркаванні; весці дыялог; творча і актыўна працаваць у групе.*

Тэхналогія: *развіццё крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо;*

***Прыёмы:***

- *двайны дзённік,*
- *вольнае пісьмо,*
- *апошняе слова,*
- *рэтраспектыўна-аналітычная гутарка.*

Абсталяванне:

- *падручнік, сшыткі па беларускай літаратуры,*
- *канверты з матэрыяламі для рэфлексіі,*
- *творчыя работы вучняў (ілюстрацыі да апявядання).*

Формы работы: *групавая, калектыўная.*

Эпіграф: *Дружба – вялікая справа. Без дружбы чалавеку цяжка жыць… Беражыце дружбу – гэта самае дарагое і важнае, што ёсць у чалавека.*

*К. Чорны*

## Стадыя выкліку

Задача: *абудзіць у вучняў цікавасць да вывучэння мастацкага твора, да ўчынкаў і паводзін герояў.*

1. *Стварэнне эмацыянальнага настрою.*

Дзень добры! І сядайце, калі ласка!
Прыйшла сустрэчы жаданая пара.
Вас запрашаю на ўрок, нібыта ў казку,
Жадаю шчасця, поспехаў, дабра!

2. *Матывацыя вучняў да далейшай дзейнасці.*

Пытанні:

- ✓ З якім творам мы пазнаёміліся на мінулым уроку?
- ✓ Назавіце герояў твора.
- ✓ Аб чым жадаеце даведацца сёння на ўроку? Якія задачы паставіце перад сабой?

Сёння вы зможаце атрымаць адказы на пастаўленыя пытанні. Мы пагаворым з вамі пра важнае, неабходнае кожнаму чалавеку пачуццё – пачуццё дружбы. Вы будзеце працаваць у групах, адчуваць падтрымку і дапамогу сваіх сяброў.

*3. Азначэнне паняцця (выступленне груп на аснове дамашніх напрацовак).*

*Настаўнік.* Кожная група рыхтавала свае заданні. Вашы паведамленні будуюцца на аснове артыкулаў тлумачальнага слоўніка беларускай мовы. Як правільна сказаць па-беларуску: сябар ці друг, дружба ці сяброўства? Зараз паслухаем паведамленне кожнай групы.

⌖ *Паведамленне 1 групы.*

У тлумачальным слоўніку беларускай мовы падаюцца паняцці “друг” і “сябар”, “дружба” і “сяброўства”. Друг – 1) гэта той, хто дружыць з кім-небудзь, блізкі сябар, прыяцель; 2) прыхільнік, абаронца каго-небудзь; 3) ужываецца як зварот да блізкага чалавека, а таксама як ветлівы зварот да таварыша, суседа ці сустрэчнага чалавека.

⌖ *Паведамленне 2 групы.*

Ёсць слова дружбак. Гэта блізкі, шчыры сябар. Сябар – 1) той, хто звязаны з кім-небудзь сяброўствам; 2) прыхільнік, абаронца. У маўленні ўжываецца і слова “сябрук”. Яно значыць “прыяцель, сябар, таварыш”. Такім чынам, сябрук, сябар, друг і дружбак – гэта словы-сінонімы.

⌖ *Паведамленне 3 групы.*

Часам мы выкарыстоўваем і словы таварыш, прыяцель. У тлумачальным слоўніку мы знайшлі іх значэнне. Таварыш – 1) чалавек, блізкі каму-небудзь па агульнасці поглядаў, дзейнаці, умовах жыцця і пад.; 2) пры савецкай уладзе зварот да грамадзяніна. Прыяцель – блізка знаёмы чалавек, з якім устанавіліся сяброўскія адносіны. Такім чынам, таварыш і прыяцель – гэта не заўсёды сябры.

⌖ *Паведамленне 4 групы.*

*Вучаніца.* Сінонімамі з'яўляюцца таксама словы дружба і сяброўства. Сяброўства – адносіны паміж кім-небудзь, якія грунтуюцца на духоўнай блізкасці, агульнасці інтарэсаў, узаемнай прыхільнасці і пад.; дружба – блізкія адносіны, заснаваныя на ўзаемным давер'і, павазе, супольнасці інтарэсаў.

**Стадыя асэнсавання.**

Задача: *дапамагчы вучням актыўна успрыняць матэрыял; стварыць атмасферу роздуму і суперажывання.*

*Настаўнік.* Дома вы працавалі з тэкстам апавядання "Сябры", кожная група над сваёй часткай твора: складалі двайны дзённік, выпісалі 3 цытаты (пачатак, сярэдзіна, канец часткі), а потым давалі свае каментарыі. Зараз у групах абмяркуйце цытаты і каментарыі, найбольш цікавы варыянт мы паслухаем. Вам былі прапанаваны пытанні, якімі вы павінны былі карыстацца, калі складалі двайны дзённік.

Пытанні:

1. Чаму на гэту цытату звярнулі ўвагу?
2. Чым яна вас зацікавіла, усхвалявала?
3. Якая цытата зрабіла найвялікшае ўражанне?

*1. Зачытванне цытат і каментарыя да іх.*

| Цытата | Каментарыі |
|---|---|
| 1. Пра Лёню Саўчанка і Грышу Міхневіча ў школе казалі, што іх вадой не разальеш. | Хлопчыкі сябравалі. Сядзелі за адной партай, жылі на адной кватэры. Звярталіся адзін да другога па дапамогу. Некаторыя ў школе зайздросцілі ім. |
| 2. Грышу Міхневічу, лепшаму вучню школы, паставілі няшчасную чацвёрку за адзін прапушчаны знак. | Грыша вельмі пакрыўдзіўся, злаваў на Лёню, вінаваціў яго ва ўсім. |
| 3. Праз лес ішлі дзве дарогі. Адна – да вёскі, а другая – да балота. Лёня, стомлены і знясілены, не заўважыў, як павярнуў да балота. | Лёню не патрэбна была пяцёрка. Ён у той момант жадаў, каб побач быў яго сябар Грыша. Лёню патрэбна яго дапамога. |
| 1. - І трэба ж, гэтак мяце і круціць – свету белага не відаць, хаця б Лёня не надумаўся ў гэтую непагадзь ісці… | Бацькі Лёні вельмі хваляваліся за сына. Яны яшчэ не ведалі, што хлопцы паспрачаліся і вырашылі пайсці дамоў. |
| 2. - А дзе ж гэта ваш Лёня? Хіба не | Суседка пацікавілася, ці прыйшоў |

| | |
|---|---|
| прыйшоў яшчэ?<br>- Няма. Куды ён пойдзе ў такую непагадзь? | дамоў Лёня. А потым сказала, што Грыша ўжо дома, але вельмі сумны, без настрою, есці адмовіўся. |
| 3. А людцы ж мае! Апранайся , Ігнат, ды бяжы хутчэй на канюшню, едзь шукаць! | Маці Лёні вельмі напалохалася. А таму хутка прынялі рашэнне, што Ігнат паедзе шукаць свайго хлопца. |
| 1. Ігнат праехаў лес, і так не сустрэўшы Лёню, вырашыў, што хлопцы ў дарозе, напэўна пасварыліся, а мо нават і пабіліся, і Лёня вярнуўся назад на кватэру. | Бацька доўга блукаў па лесе. Лёню ён так і не знайшоў. Думкі былі розныя, але Ігнат працягваў пошукі. Стаў зваць сына ўсё мацней і мацней. |
| 2.- Сынок! Лёня! – мацней закрычаў Ігнат.<br>-Я ту-ут! – данеслася з цемры. | Ігнат абрадаваўся: Лёня адгукнуўся. Значыць, жывы! |
| 3. Здарылася якраз тое, чаго баяўся Ігнат: доўга блукаючы па балоце, хлопец праваліўся ў незамерзлую багну. | Хутка сцямнела. Лёня збіўся з дарогі і павярнуў да балота. |
| 1. Неяк раніцай у нядзелю, калі Лёня ўжо ачуньваў, у сенцах пачулася нясмелае тупанне, потым адчыніліся дзверы і ўвайшоў Грыша Міхневіч. | Грыша лічыў сябе вінаватым у тым, што здарылася. Ён рашыў наведаць сябра і памірыцца з ім. |
| 2. Што было, тое быллём парасло. Усё прайшло і няма чаго перагаворваць. Праходзь, брат, бліжэй да Лёні ды расказвай… | Словы Ігната падбадзёрылі Грышу. Ён адчуў, што Лёня не крыўдзіцца на яго і ўсё даўно дараваў. |
| 3. Зразумеўшы, што ён памілаваны, Грыша перасеў на ложак да Лёні. | Сябры зноў разам! |

2. *Рэтраспектыўна-аналітычная гутарка (праца з мастацкім тэкстам).*

*Настаўнік.* Зараз кожная група атрымае канверт з пытаннямі. Пытанні і адказы абмяркуеце ў групах, а потым будзеце адказваць.

- Чаму пра Лёню Саўчанка і Грышу Міхневіча казалі, што іх вадой не разальеш? (Сядзелі за адной партай. Жылі на адной кватэры. Звярталіся адзін да другога за дапамогай).
- Што адбылося паміж хлапчукамі ў школе? Якім паказвае сябе Грыша? (Грыша атрымаў горшую, чым Лёня, адзнаку, хаця лічыўся лепшым вучнем. Паводзіў сябе ганарыста, пагардліва, вінаваціў Лёню).
- Раскажыце, як Лёня трапіў у бяду. (Грыша не пачакаў сябра па дарозе дадому, і Лёня заблукаў у цёмным заснежаным лесе).

- Ці можам мы сказаць, што Грыша кінуў сябра ў бядзе? (Не. Ён не глядзеў на сябра, каб паказаць сваю крыўду, але яму стала страшна – азірнуўся: стаў непакоіцца за Лёню, хутка пабег па дапамогу дамоў).
- Ці правільна зрабіў Грыша, калі пабег дадому, каб расказаць дарослым, што здарылася? (Так. Сам ён мог бы заблукаць у цёмным лесе і не дапамог бы сябру).
- Раскажыце аб выратаванні Лёні.
- Што адчуваў Лёня ў час прыходу сябра? (Ён быў шчаслівы бачыць Грышу і ўсё яму даравáў).
- Ці паўплывала на Грышу ўся гэта гісторыя? (Грыша адчуваў сябе вінаватым. Ён зразумеў сваю памылку. Усё сам расказаў у школе, хацеў, каб яго выключылі са школы. Дома ад бацькі атрымаў лупцоўку).

*3. Абарона творчых работ (ілюстрацыі да твора).*

*4. Прыказкі пра сяброўства.*

*Настаўнік.* Прыказкі, якія ствараліся на працягу стагоддзяў, змяшчаюць мудрасць народа, яго жыццёвы вопыт. Многія з іх вучаць, як трэба сябраваць, як ставіцца да сяброў. Я чытаю пачатак прыказкі, а вы яе заканчваеце.

- Не той сябар, хто мёдам мажа, а той (хто праўду кажа).
- Новых сяброў набывай, а (старых не забывай).
- Не май сто рублёў, а (май сто сяброў).
- Скажы мне, хто твой сябар, і (я скажу, хто ты).
- З разумным сябрам павядзешся – (розуму набярэшся).
- Дружба пазнаецца ў (няшчасці).
- Сябра за грошы (не купіш).
- Дружба дружбай, а (служба службай).

## Стадыя рэфлексіі

Задача: *дапамагчы вучням абагуліць матэрыял апавядання.*

*1. Творчая работа. Прыём "Вольнае пісьмо"*

*Настаўнік.* Сёння мы многа гаварылі пра сяброўства, абмеркавалі ўчынкі герояў апавядання Алены Васілевіч "Сябры". Прапаную вам напісаць вольнае пісьмо "Сапраўдны сябар – гэта…"

*2. Вучні зачытваюць вольнае пісьмо.*

- Сапраўдны сябар – гэта чалавек, які ніколі не здрадзіць і не кіне ў цяжкую хвіліну.
- Сапраўдны сябар – гэта чалавек, які ўмее сябраваць.
- Сапраўдны сябар – добры чалавек. Ён заўсёды побач.
- Сапраўдныя сябры заўсёды разам, у іх агульныя інтарэсы, яны ўмеюць даравáць і разумець адзін аднаго.

*3.Апошняе слова.*

*Вучань.* На маю думку, сапраўдны сябар – гэта той чалавек, да якога можна звярнуцца ў любы час. Гэта той чалавек, які з табой не толькі раздзеліць

турботы, але парадуецца за твае поспехі. У чалавека павінен быць сябар на ўсё жыццё. Сябры могуць спрачацца, сварыцца і мірыцца. Але адзін без аднаго яны жыць не могуць. Так адбылося і ў апавяданні Алены Васілевіч "Сябры".

*Настаўнік.* Кожная група атрымала канверт, у якім знаходзяцца аркушы паперы з напісанымі паняццямі. Гэтыя паняцці неабходна размясціць насупраць колераў светлафора, які вы бачыце на дошцы.

(*Паняцці: дабрыня, узаемадапамога, спрэчка, зайздрасць, чалавечнасць, надзейнасць, уменне цярпець слабасці друга, няшчасце, дрэнны настрой, падман, крыўда, дабрыня, давер, падтрымка, узаемаразуменне, раўнадушша, здрадніцтва*).

**Насупраць чырвонага колеру**: Што не трэба браць у жыццёвую дарогу сапраўдным сябрам? (*зайздрасць, падман, раўнадушша, здрадніцтва і т.д.)*

**Насупраць жоўтага колеру:** Калі трэба быць сапраўдным сябрам? *(спрэчка, няшчасце, дрэнны настрой і т.д.)*

**Насупраць зялёнага колеру**: Што трэба браць з сабой сапраўдным сябрам? (*дабрыня, чалавечнасць, давер, падтрымка, узаемадапамога, узаемапавага і т.д.)*

*3. Выстаўленне і каменціраванне адзнак.*

*Настаўнік.* Зараз у групах выстаўце і абмяркуйце адзнакі. Кожная група атрымлівае апошні канверт, у якім знаходзяцца літары. Вам неабходна скласці словы, а потым – сказ.

*(Кожная група складае словы, а потым атрымліваецца сказ: "Давайце будзем сябраваць заўжды!".)*

*4. Заключнае слова настаўніка.*

*Настаўнік.* Жадаю вам, дзеці, каб вы знайшлі ў жыцці сапраўдных сяброў, сябравалі і берaглі адзін аднаго. Яшчэ раз звяртаю вашу ўвагу на эпіграф да ўрока. Помніце гэтыя словы. Без сябра чалавек не зможа жыць. Дзякуй за добрую працу на ўроку.

*5. Дамашняе заданне.*

Пераказ апавядання па плане.